Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт
імя Максіма Танка”

Кафедра беларускага  і рускага мовазнаўства

Вучэбны матэрыял па тэме

# “СІСТЭМА ДЗЕЯСЛОЎНЫХ ФОРМ. АСНОВЫ ДЗЕЯСЛОВА”

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

па дысцыпліне “Беларуская мова”
для спецыяльнасці:
1-01 01 01  Дашкольная адукацыя

Склала дацэнт Мордас Н.Р.

Мінск
2019

**ЗМЕСТ**

**1. Тэарэтычны раздзел**

1.1. Сістэма дзеяслоўных формаў

1.2. Неазначальная форма дзеслова, яе граматычныя асаблівасці і сінтаксічная функцыя

1.3. Дзве асновы дзеяслова: аснова інфінітыва і аснова цяперашняга (будучага простага) часу. Утварэнне формаў дзеясловаў ад дзвюх асноў

**2. Пытанні да самакантролю ведаў**

**3. Практычныя заданні**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 1. Тэарэтычны раздзел

### 1.1. Сістэма дзеясloўных формаў

Дзеяслоў мае багатую і складаную сістэму формаў, сярод якіх вылучаюцца чатыры разрады: інфінітыў (неазначальная форма дзеяслова), асабовыя формы (формы асобы, ліку, ладу, часу, роду), дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе.

Дзеяслоўныя формы ў залежнасці ад марфалагічных прымет і сінтаксічных функцый дзеляцца на спрагальны і неспрагальныя, зменныя і нязменныя.

Формы дзеяслова:

- ***Спрагальныя***– *асабовыя формы*, яны змяняюцца па асобах, ліках, ладах, часах ( а ў прошлым часе і ўмоўным ладзе – і па родах).

- ***Неспрагальныя*** – *інфінітыў, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе* ( не спрагаюцца).

Агульныя прыметы паміж спрагальнымі і неспрагальнымі формамі: агульнасць лексічнага значэння, наяўнасць катэгорый трывання і стану, агульнасць кіравання, аднолькавая магчымасць прымыкання прыслоўя.

- ***Нязменныя*** – *інфінітыў, дзеепрыслоўе*. Не спрагаюцца, не скланяюцца, але маюць катэгорыі трывання і стану.

- ***Зменныя*** – *асабовыя формы, дзеепрыметнік*. Асабовыя формы дзеяслова спрагаюцца, дзеепрыметнік – скланяецца. Менавіта ім уласціва катэгорыя ліку (*вучань піша – вучні пішуць, зжатае поле – зжатыя палі)*.

Сінтаксічная функцыя дзеяслоўных формаў неаднолькавая. Асабовыя (спрагальныя) формы дзеяслова ў сказе выконваюць функцыю выказніка: *Лес супакойвае, разганяе трывогу.* Інфінітыў можа быць любым членам сказа: *Жыць – Радзіме служыць.* Дзеепрыметнік выступае ў ролі азначэння (поўная форма) ці выказніка (кароткая форма): *Сад хоць невялікі, але дагледжаны.* Дзеепрыслоўе выконвае сінтаксічную ролю акалічнасці: *Жартуючы, па вуліцы прайшла моладзь.*

Агульная характэрная сінтаксічная прымета ўсіх дзеяслоўных формаў – здольнасць кіраваць скланяльнымі часцінамі мовы, якія выступаюць у ролі дапаўнення ці акалічнасці (*прывезці з горада, прывёз з горада, прывязу з*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*горада, прывязі з горада, прывезены з горада, прывёзшы з горада*), да іх можа прымыкаць прыслоўе (*уважліва прачытаць, прачытаю, прачытай, прачытаўшы).*

### 1.2. Неазначальная форма дзеслова, яе граматычныя асаблівасці і сінтаксічная функцыя

***Інфінітыў*** -- гэта неазначальная, нязменная форма дзеяслова, якая абазначае дзеянне ці стан, але не ўказвае на асобу, час, лік: *Прыемнасць – пазнаёміцца з чалавекам ветлым, радасць – пагутарыць з разумным, удача – знайсціся ў патрэбе са смелым, шчасце – жыць, працаваць з чалавекам сумленным* (М.Т.).

Для інфінітыва ўласцівыя толькі асобныя граматычныя катэгорыі: трыванне (закончанае і незакончанае): *берагчы – зберагчы,* стан (незалежны і залежны): *абмяркоўваць – абмяркоўвацца*, пераходнасць і непераходнасць (*будаваць школу – ісці па дарозе*), зваротнасць і незваротнасць (*сустракацца – сустракаць*). Інфінітыў не змяняецца па асобах і ліках, не мае форм часу і ладу; яму ўласцівы формаўтваральныя суфіксы -*ць* (далучаецца да асновы на галосны): *піса-ць, глядзе-ць*; -*ці* (да асновы на зычны): *лез-ці, плес-ці*; -*чы* (да асновы на заднеязычныя *г, к*): *бегчы, стрыгчы*. Дзеясловы з асновай цяперашняга часу на *к* (*валакуць, таўкуць)* у інфінітыве звычайна ўжываюцца без *к* **(***валачы, таўчы, пячы).* Толькі адзін дзеяслоў мае варыянты *сячы – секчы* (пры перавазе першага варыянта).

Неазначальная форма дзеяслова можа ўжывацца ў ролі любога члена сказа. Інфінітыў у сказе бывае:

- дзейнікам: *У дружбе жыць – такая воля, такі закон спрадвеку ў нас* (Пр.);
- выказнікам: *Кветкам красавацца, гарэць агнём чырвоным* (Бр.);
- дапаўненнем: *Туравец загадаў залегшы ўсім пры дарозе* (І.М.);
- азначэннем: *Адзін Міхал і грэў імкненне давесці справу да скančэння* (К-с);
- акалічнасцю: *Прыехалі знаёміцца новыя суседзі* (Шам.).

### 1.3. Дзве асновы дзеяслова: аснова інфінітыва і аснова цяперашняга (будучага простага) часу. Утварэнне формаў дзеясловаў ад дзвюх асноў

Усе спрагальныя і неспрагальныя дзеяслоўныя формы ўтвараюцца ад дзвюх асноў: асновы інфінітыва і асновы цяперашняга (будучага простага) часу. ***Аснова інфінітыва*** – гэта частка інфінітыва без формаўтваральнага суфікса: *спява-ць, лез-ці, бег-чы*. Яна супадае з асновай прошлага часу

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дзеяслова, якая вызначаецца аддзяленнем суфікса прошлага часу: *збіра-ць, збіра-ў*. Аднак часам асновы інфінітыва і прошлага часу адрозніваюцца, і такія дзеясловы маюць 3 асновы: інфінітыва *плес-ці*, цяперашняга (будучага простага) часу *плят-уць*, прошлага часу *плё-ў*.

Ад асновы інфінітыва ўтвараюцца формы прошлага часу абвеснага ладу, а таксама ўмоўнага ладу: *глядзе-ць – глядзе-ў, глядзе-ў бы*; дзеепрыметнікі залежнага стану прошлага часу: *адрэза-ць – адрэза-н-ы, спілава-ць – спілава-н-ы*; дзеепрыслоўі закончанага трывання: *спыні-ць – спыні-ўшы, заеха-ць – заеха-ўшы.*

***Аснова цяперашняга*** часу (будучага простага – у дзеясловах закончанага трывання) вылучаецца шляхам аддзялення канчаткаў *-уць (-юць), -аць(-яць)* ад дзеясловаў у форме 3-й асобы множнага ліку цяперашняга часу (будучага простага): *піш-уць, мый-уць.*

Ад асновы цяперашняга часу ўтвараюцца асабовыя формы цяперашняга (будучага простага) часу абвеснага ладу: *воз-яць – воз-іш, воз-ім, воз-іце*; формы загаднага ладу: *гуляй-уць – гуляй, гуляй-це, гуляй-ма*; дзеепрыметнікі цяперашняга часу: *малюй-уць – малюй-учы (малюючы), сядз-яць – седз-яч-ы*; дзеепрыслоўі незакончанага трывання: *нос-яць – нос-ячы, шука-юць – шука-ючы.*

Асновы інфінітыва і цяперашняга часу могуць супадаць (*бераг-чы і бераг-уць*), і не супадаць (*хадзі-ць і ходз-яць*). У зваротных дзеясловах постфікс -*ся* ўваходзіць у склад асновы слова (перарывістая аснова): *купацца* -- аснова інфінітыва *купа-…-ца,* цяперашняга часу: *купай-…-ца*.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## 2. Пытанні да самакантролю ведаў

*1. Раскажыце пра сістэму дзеяслоўных форм у сучаснай беларускай мове.*

*2. Якая форма дзеяслова называецца неазначальнай? У чым заключаюцца яе граматычныя асаблівасці? Якую сінтаксічную функцыю яна выконвае ў сказе?*

*3. Пералічыце спрагальныя дзеяслоўныя формы.*

*4. Пералічыце неспрагальныя дзеяслоўныя формы.*

*5. Назавіце зменныя формы дзеяслова і ахарактарызуйце іх.*

*6. Назавіце нязменныя формы дзеяслова і ахарактарызуйце іх.*

*7. Як вызначаецца аснова інфінітыва?*

*8. Якія граматычныя формы ўтвараюцца ад асновы інфінітыва? Прывядзіце прыклады.*

*9. Як вызначаецца аснова цяперашняга (простага будучага) часу.*

*10. Якія граматычныя формы ўтвараюцца ад асновы цяперашняга часу?*

## 3. Практычныя заданні

**Заданне 1. Выпішыце з тэксту дзеясловы, вызначце іх форму (інфінітыў, спрагальныя формы, дзеепрыметнік, дзеепрыслоўе) і сінтаксічную функцыю ў сказе.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Вясновае, нястрыманае

Нечакана надышла вясна. Пачаў увачавідкі сыходзіць зляжалы снег, агаляючы дахі дамоў, хлеўчыкаў і розных прыбудоў… Пад цёплымі сонечнымі промнямі закапала, зазвінела вада, змятаючы на сваім шляху ўсё.

Снег збягаў пакручастымі вяртлявымі ручаінамі, што адмяжоўвалі нашу сядзібу і суседнюю. Нястрымна лілося сонца, праганяючы холад зімы з глебы. І яна мякчэла, рабілася спрыяльнай, падатлівай для рыдлёўкі…

Якая гэта непаўторна прыгожая, захапляючая пара для вясковых хлопчыкаў і дзяўчынак! Як радасна, лёгка было скінуць зімовае паліто, шапку-аблавушку, адчуць вясновае цяпло! Атрымліваўся цудоўны народны абрад. Спачатку скідвалася зношанае паліто, мянялася на лёгкую целагрэйку, потым – ватная шапка і пазней ужо – валёнкі, перш тыя, што насіліся без галёшаў. А як весела складваліся шматлікія папяровыя самалёцікі з аркушаў старых школьных сшыткаў нашых старэйшых братоў і сясцёр, таварышаў!.. Гэтыя самалёцікі, як белыя птушкі, лёталі ў паветры, і мы, зачараваныя, назіралі за імі, суправаджаючы палёт крыкам і смехам.

(Л.Валасюк)

**Заданне 2. Выпішыце з прыказак інфінітывы, вызначце іх аснову, граматычныя катэгорыі і сінтаксічную функцыю ў сказе.**

1. Пісаць – не сякерай махаць. 2. Лёгка толькі кашу есці з вялікай міскі. 3. Цяжэй за ўсё чакаць і нічога не рабіць. 4. За сном няма калі адпачываць. 5. Калі іграць не ўмееш, за гармонь не бярыся. 6. Каб хлеб мець, трэба зямліцу глядзець. 7. Вучыцца ніколі не позна. 8. Добры чалавек і сабакі дражніць не будзе. 9. Трэба нахіліцца, каб з ручая напіцца. 10. За вочы дык і мышаня кату хвост адкусіць пагражае. 11.Рупная пчала ўмее ў соты мёд сабраць і з горкіх кветак. 12. Зламаць заўсёды лягчэй, чым наладзіць.

**Заданне 3. Выпішыце з тэксту спрагальныя формы дзеяслова, вызначце іх аснову і граматычныя катэгорыі.**

Першымі ў сяле прачынаюцца не пеўні, якія гарланілі з другой палавіны ночы, не сабакі, што брахалі без дай прычыны ўсю ноч, а птушкі. Яшчэ не ўзышло сонца, яшчэ белая, мяккая празрыстасць выганяе апошнія паўзмрокі, што хаваюцца па кутках, а на вішні, якая стаіць пры самай хаце, усчынаюць гамонку вераб'і. Вішня хутка вырасце, абымшэе, ягад на ёй пакуль няма, так што няма і вераб'ям пажытку, і яны, мабыць, проста радуюцца дню і святлу. Потым прылятае варона, садзіцца на вільчык хаты і доўга, аднастайна каркае. Прачысціўшы горла, варона знікае, а на змену ёй прыбываюць сарокі. Яны прымошчваюцца на штыкетніку, скачуць з калка на калок, трашчаць, мітусяцца і, нарэшце, пералятаюць на суседні двор.

(І.Навуменка)

**Заданне 4. Напішыце сачыненне на тэму "Мая прафесія – педагог", выкарыстойце ў тэксце 5-7 інфінітываў. Вызначце іх сінтаксічную ролю.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

**Заданне 5. Вызначце аснову інфінітыва і аснову цяперашняга часу дзеясловаў, запішыце. Растлумачце, як іх выдзяляюць.**

У з о р: Абараняць – абараця-ць, абараняюць – абараняј-уць; ляцець – ляце-ць, ляцяць – ляц-яць.

Памяншаць – памяншаюць, змахваць – змахваюць, пячы – пякуць, вышываць – вышываюць, пералічваць – пералічваюць, глядзець – глядзяць, сватаць – сватаюць, сушыць – сушаць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ